**С. Я. Новікаў**

# ІНСТРУМЕНТАЛІЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ Ў СУЧАСНАЕ НАВУЧАННЕ, ВЫХАВАННЕ І ПАМЯЦЬ

***75-й гадавіне Вялікай Перамогі прысвячаецца***

У гэтым годзе ў нашай суверэннай краіне адзначацца 75-годдзе Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. У сістэме сучаснай гістарычнай адукацыі асабліва важнае месца займае вывучэнне гісторыі Беларусі ў 1941–1945 гадах. Беларускі народ вынес суровыя выпрабаванні, ведучы барацьбу на франтах і ў тыле, у партызанскіх атрадах і падполлі, пераадольваючы неймаверныя цяжкасці, несучы велізарныя ахвяры, але ўносячы пры гэтым надзвычай важкі ўклад у здабыццё Вялікай Перамогі.

Напярэдадні гэтай адметнай даты Міністэрства адукацыі разам з Нацыянальным інстытутам адукацыі і Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі выступілі з ініцыятывай аб перавыданні першага ў Беларусі і адзінага на прасторах СНД вучэбнага падручніка «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)», упершыню падрыхтаванага і выдадзенага ў адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка да 60-годдзя вызвалення Беларусі [1; 2; 3; 4], а таксама перавыдадзенага да 65-годдзя Вялікай Перамогі [5]. Як адзначаў Прэзідэнт у прадмове да юных чытачоў, «няхай паручнік дапаможа вам яшчэ больш даведацца аб трагічных і гераічных старонках нашага мінулага, узбагаціць тыя веды аб Вялікай Айчыннай вайне, якія вы набылі ў школе, з расказаў ветэранаў і пры наведванні музеяў і памятных мясцін, звязаных з барацьбой супраць захопнікаў. Умацуе пачуццё павагі да роднай зямлі і гонару за беларускі народ» [1, с. 6; 2, с. 6; 4, с. 6; 5, с. 6].

Дапаможнік падрыхтаваны калектывам беларускіх гісторыкаў у складзе А. А. Кавалені, М. А. Красновай, У. І. Лемяшонка, С. Я. Новікава, М. Г. Жылінскага, Б. Дз. Далгатовіча, К. І. Козака (паводле напісання аўтарскага складу. – *С. Н.*). Навуковымі рэдактарамі вучэбнага выдання з'яўляліся А. А. Каваленя і М. С. Сташкевіч. Рэдагаванне, вёрстка і выданне былі забяспечаны ў выдавецкім цэнтры БДУ.

У артыкуле праводзіцца аналіз дыдактычнай базы вучэбнага дапаможніка; асвятляюцца адукацыйныя кампетэнцыі, набыццё якіх вучнямі сярэдніх школ і студэнтамі ўніверсітэтаў стала магчымым у ходзе засваення зместу вучэбнай дысцыпліны і іншых форм самастойнай работы; раскрываецца выхаваўчы патэнцыял асноўнага, дадатковага і дакументальнага матэрыялаў, а таксама візуальных крыніц дапаможніка; паказваецца асаблівая роля матэрыялаў вучэбнага дапаможніка ў фарміраванні культуры памяці ў сучаснай Беларусі.

Вучэбнае выданне складаецца з трох раздзелаў (падзеленых на параграфы). У першым асвятляюцца падзеі напярэдадні Другой сусветнай вайны і яе пачатак. Другі раздзел прысвечаны гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У трэцім раздзеле разглядаюцца заключны перыяд вайны, паказваецца ўклад беларускага народа ў разгром агрэсара. Галоўнай мэтай вучэбнага дапаможніка з'яўляецца выхаванне патрыятычных і грамадзянскіх пачуццяў, адказнасці за будучыню Радзімы і сусветнай супольнасці, нацыянальнай годнасці [1, с. 7; 2, с. 7; 4, с. 7; 5, с. 7]. Для яе дасягнення на старонках падручніка выкарыстоўваліся навуковыя і метадычныя навацыі, на аснове якіх адбываецца ўдасканаленне вучэбна-выхаваўчага працэсу сярод школьнай і студэнцкай моладзі.

Скразной ідэяй вучэбнага дапаможнікі аўтары бачылі думку пра тое, што для беларускага народа гістарычная памяць пра Вялікую Айчынную вайну і Вялікую Перамогу адыгрывае асабліва важную ролю, выступаючы ва ўсе пасляваенныя гады ў якасці аднаго з фактараў кансалідацыі грамадства. Асаблівая значнасць ваеннай тэматыкі звязана з тым, што яна выступае адной з нешматлікіх гістарычных падзей, якая трывала прысутнічае ў калектыўнай памяці народа. Больш таго, на цяперашні час вывучэнне гэтай тэмы становіцца асабліва актуальным. Па-першае, у кантэксце пастаянных выклікаў па перапісванні гісторыі вайны ў інтарэсах пэўных палітычных колаў, спроб некаторых замежных гістарыяграфій у пераглядзе ролі Чырвонай арміі і Савецкага Саюза ў Другой сусветнай вайне. Па-другое, асобнымі айчыннымі і замежнымі гісторыкамі ставіцца пад сумнеў усенародны характар Вялікай Айчыннай вайны, змяншаецца значэнне партызанскай і падпольнай барацьбы. Па-трэцяе, у новых працах апошняга часу сталі больш паглыблена разглядацца пытанні, якія ў савецкі час замоўчваліся і заставаліся «белымі плямамі» ваеннай гісторыі. У якасці не менш важнай прычыны неабходна прывесці і тое, што цяперашнія школьнікі ва ўмовах істотнага ўзмацнення розных інфармацыйных рэсурсаў не заўсёды здольны самастойна і зарыентавацца, і знайсці правільны адказ, і паставіць новыя пытанні.

У змесце і падыходах да асвятлення падзей Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў у вучэбным дапаможніку знайшлі адлюстраванне як дасягненні мінулага часу, так і найноўшыя даследаванні [7; 8]. Побач з вывучэннем тэм, традыцыйных ў школьных курсах навучання, былі ўведзены новыя тэмы. У падручніку шырока асвятляецца масавы гераізм савецкага народа, паказаны сутнасць германскага акупацыйнага рэжыму і палітыкі нацысцкага генацыду, формы і метады барацьбы партызан і падпольшчыкаў за вызваленне Радзімы і ўклад савецкага народа ў перамогу над гітлераўскай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй.

У вучэбным дапаможніку з якасці абавязковых дадаткаў да тэматычных тэкстаў прыведзена вялікая колькасць дакументаў як афіцыйнага, так і асабістага паходжання, шырока выкарыстоўваюцца фотаздымкі, карты, табліцы, схемы, дыяграмы і інш. [6]. З’явілася новая тэма «Памяць аб вайне». З гэтай мэтай была ўведзена рубрыка «Складаем летапіс вайны», у аснову якога павінны легчы ўспаміны родных, суседзяў, знаёмых. Усё гэта і іншае стварыла тую базу, на якой вывучэнне Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў закладвалі надзейны падмурак для выхавання ў падрастаючага пакалення нацыянальнай самасвядомасці, пачуцця патрыятызму і гонару за сваю краіну, сувязі і пераемнасці пакаленняў, адзінства ўсяго народа ў ходзе барацьбы за перамогу над ворагам [9; 10; 11; 12; 13; 14].

У артыкуле чытачу прапануецца разгляд толькі асобных гістарычных падзей вайны, што адбываліся на тэрыторыі Беларусі і савецкай краіны і дзякуючы якім была здабыта Вялікая Перамога. Канцэптуальным момантам у такім падыходзе аўтары разглядалі тэзіс аб тым, што перамога Савецкага Саюза ў вайне стала магчымай дзякуючы намаганням усяго савецкага народа, цеснаму ўзаемадзеянню арміі, партызан, падпольшчыкаў і савецкага тылу. У якасці метадалагічнай аксіёмы для настаўнікаў школ і выкладчыкаў устаноў вышэйшай адукацыі была вылучана трыадзіная задача па інструменталізацыі гісторыі перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне ў сучаснае навучанне, выхаванне і памяць.

## Насустрач Вялікай Перамозе

Ключавую ролю ў дасягненні перамогі над гітлераўскай Германіяй адыграла Чырвоная армія, яе баявыя дзеянні на савецка-германскім фронце з першага дня вайны сталі вызначальнымі на шляху да першых малых перамог, якія ў выніку прывялі да Вялікай Перамогі савецкай зброі над германскімі захопнікамі. У вучэбным дапаможніку гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі адведзены толькі чатыры параграфы ці чвэрць ад усіх вучэбных матэрыялаў (5 «Крах “маланкавай вайны”» [1–2, с. 66–85; 4, с. 76–98; 5, с. 66–85], 11 «Карэнны пералом у Вялікай Айчыннай вайне» [1–2, с. 140–156; 4, с. 160–178], 12 «Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў» [1–2, с. 156–168; 4, с. 178–193; 5, с. 156–168], 13 «Разгром нацысцкай германіі і мілітарысцкай Японіі») [1–2, с. 183–201; 4, с. 211–233; 5, с. 183–201;]. Фарміраванню і развіццю вучэбна-пазнавальных і даследчых кампетэнцый

школьнікаў і студэнтаў спрыяў разгляд гісторыі абарончых падзей як на тэрыторыі Беларусі ў першыя месяцы вайны, так і баявыя дзеянні Чырвонай арміі на савецка-германскім фронце ў 1941–1944 гг. і разгром нацысцкай германіі і мілітарысцкай Японіі ў 1945 годзе.

Баявыя дзеянні Чырвонай арміі на савецка-германскім фронце ў першыя месяцы вайны былі вельмі неспрыяльнымі для СССР. Ваенна-палітычнае кіраўніцтва Савецкага Саюза імкнулася сканцэнтраваць неабходныя сілы для арганізацыі рашучага контрудару. У чэрвені–жніўні 1941 г. войскі Чырвонай арміі вялі цяжкія абарончы баі супраць праціўнікі. На беларускім напрамку наступала баяздольная група армій «Цэнтр» пад камандаваннем фельдмаршала Ф. фон Бока. Ёй процістаялі сілы Заходняй Асобнай ваеннай акругі на чале з генералам арміі Дз. Р. Паўлавым. У акрузе налічвалася каля 672 тыс. байцоў і камандзіраў, на ўзбраенні мелася больш 10 тыс. гармат і мінамётаў, 2502 танкі, у тым ліку КВ і Т-34, а таксама 1909 самалётаў, з якіх 424 былі новымі. Галоўная задача акругі заключалася ў забеспячэнні прыкрыцця заходняга напрамку ад паўднёвай граніцы Літвы да паўночнай граніцы Украіны.

Да апошняга часу ў айчыннай гістарыяграфіі панавала думка, што Чырвоная армія на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. у выніку панесеных велізарных страт і нягледзячы на ўпартае супраціўленне войскаў Заходняга фронту, гераізм, мужнасць і адвагу чырвонаармейцаў у ходзе пагранічных баёў, арганізацыі актыўнага адпору праціўніку пад Мінскам, Віцебскам, Магілёвам, на гомельскім і бабруйскім напрамках, правядзення контрудараў войскаў Чырвонай арміі пад Лепелем, Жлобінам і Рагачовам не здолела спыніць германскі вермахт, які даволі хутка прасоўваўся ў глыб тэрыторыі Беларусі і да пачатку верасня цалкам яе захапіў.

Між тым, новыя беларускія даследаванні даюць дакументальную падставу ўбачыць новыя аспекты тых гістарычных падзей. На думку аўтараў вучэбнага дапаможніка, якраз у ходзе абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. пачалася пісацца адна з слаўных старонак Вялікай Перамогі Чырвонай арміі, асабліва ў аспекце паказу рэальнага значэння супраціўлення войскаў Заходняга фронту ў зрыве аперацыі пад кодавай назвай «Барбароса», перш за ўсё ў яе галоўнай частцы – захопу савецкай тэрыторыі ў ходзе ажыццяўлення плана «маланкавай вайны» (Blitzkrieg). Менавіта ў ходзе баёў на тэрыторыі Беларусі адбыўся крах гэтага злачыннага плана: 31 ліпеня 1941 г. А. Гітлер нечакана для галоўнага камандавання вермахта аддаў загад № 34 аб спыненні наступлення і пераходзе да абароны групы армій «Цэнтр». Як сёння даказана ў найноўшых беларускіх даследаваннях, галоўнай прычынай у той час стала наступленне 63-га стралковага корпуса пад камандаваннем Л. Р. Пятроўскага на Бабруйскім напрамку з 13 ліпеня па 17 жніўня 1941 г. і ўпартыя баі часцей Чырвонай арміі на рубяжы Жлобіна і Рагачова [8, с. 95].

У гэтай сувязі неабходна звяртаць увагу школьнікаў і студэнтаў на важнасць фарміравання ўменняў комплекснага аналізу гістарычных падзей, разгляду іх ва ўзаемасувязі, выяўлення прычынна-следчых сувязей паміж імі

з мэтай аб'ектыўнай ацэнкі тых падзей. Такім чынам, у выніку баёў на паўднёвым участку савецка-германскага фронту ў Беларусі было адсунута на 2 месяцы новае наступленне вермахта на цэнтральным напрамку на Маскву, калі толькі ў канцы верасня і пачатку кастрычніка група армій «Цэнтр» пачала аперацыю пад кодавай назвай «Тайфун» з мэтай захопу Масквы і Маскоўскага прамысловага раёна. Але гэта наступленне германскага вермахта цалкам правалілася. Стварыліся ўмовы для пераходу савецкіх войскаў у контрнаступленне і разгрому ворага пад Масквой. Контрнаступленне Чырвонай арміі стала паваротным пунктам не толькі на савецка-германскім фронце, але і ў ходзе Другой сусветнай вайны. Разгром войскаў вермахта пад Масквой азначаў поўны крах гітлераўскай стратэгіі «маланкавай вайны», развеяў міф аб непераможнасці германскай арміі, змяніў стэрэатыпы, з якіх многія заходнія палітыкі падыходзілі да СССР. З гэтага моманту Чырвоная армія разам з краінамі антыгітлераўскай кааліцыі вялі ўзброеную барацьбу супраць Германіі і яе саюзнікаў.Галоўнымі падзеямі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў другой паловы 1942–1943 гг. з'яўляліся Сталінградская і Курская бітвы, якія паклалі пачатак карэннаму пералому ў вайне. Поспех, дасягнуты Чырвонай арміяй пад Масквой быў замацаваны новымі перамогамі пад Сталінградам у ходзе Сталінградскай (17 ліпеня 1942–2 лютага 1943 г.) і Курскай (5 ліпеня–23 жніўня 1943 г.) бітваў. Пасля перамогі ў Курскай бітве Чырвоная армія разгарнула стратэгічнае наступленне ад Невеля на поўдні Пскоўскай вобласці да Чорнага мора на франтавой лініі працягам 2000 км. На цэнтральным участку фронту савецкія войскі працягнулі наступленне і пачалі вызваленне Беларусі. Летам 1944 г. перад савецкімі войскамі была пастаўлена задача разбіць цэнтральную групоўку нямецкіх войскаў – групы армій «Цэнтр», вызваліць Беларусь і выйсці да дзяржаўнай граніцы СССР.

Беларуская наступальная стратэгічная аперацыя (23 чэрвеня–29 жніўня 1944 г.) па сваіх маштабах, колькасці сіл, што ўдзельнічалі ў ёй, з'яўляецца адной з самых буйных не толькі ў Вялікай Айчыннай, але і ў Другой сусветнай вайне. У наступныя паўтара гады Чырвоная армія правяла шэраг буйных наступальных аперацый па вызваленні народаў еўрапейскіх краін. Яна пазбавіла ад германскага рабства адзінаццаць краін Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы з насельніцтвам 113 млн чалавек. Разгром нацысцкай Германіі стаў вынікам Берлінскай аперацыі (16 красавіка–8 мая 1945 г.). Гэта аперацыя мела вырашальнае значэнне для поўнага разгрому Германіі і вызвалення нямецкага народа ад гітлераўскай дэспатыі. 30 красавіка над рэйхстагам быў узняты Сцяг Перамогі. Вайна ў Еўропе закончылася. 9 мая 1945 г. савецкія краіны святкавалі Дзень Перамогі. 24 чэрвеня 1945 г. на Краснай плошчы ў Маскве адбыўся Парад Перамогі.

Такім чынам, вучэбныя тэкставыя матэрыялы, дадатковыя крыніцы і візуальныя звесткі раскрываюць важнае значэнне баявых дзеянняў Чырвонай арміі на савецка-германскім фронце, дзе з першых абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі пачаў кавацца меч Вялікай Перамогі. Значнаму паглыб-ленню ведаў вучняў і студэнтаў у ходзе вывучэння матэрыялаў вучэбнага дапаможнікі

садзейнічаюць не толькі асноўныя (тэксты) і дадатковыя матэрыялы (дакументы і вытрымкі з іх), візуальныя матэрыялы (фота, карты, дзённікі, табліцы, дыяграмы), а таксама пытанні і заданні для самастойнай работы, спіс крыніц і літаратуры, рубрыка «Ствараем лепапіс вайны».

## Гістарычнае значэнне Вялікай Перамогі

Гістарычнае значэнне Вялікай Перамогі знайшло адлюстраванне не толькі ў вышэйзгаданых параграфах, але і ў асобнай тэме – «Вынікі і ўрокі вайны» [1–2, с. 201–209; 4, с. 233–243; 5, с. 201–209]. Актуалізацыя ведаў пра перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне патрабуе вызначэння тых асноўных фактараў, якія садзейнічалі разгрому небывалай у гісторыі па сваіх маштабах і жорсткасці вайны супраць нацысцкай Гермнаіі. У ходзе вайны савецкія Узброеныя сілы правялі больш за 40 буйных стратэгічных наступальных аперацый, якія завяршыліся разгромам магутных груповак ворага. У выніку былі дасягнуты найважнейшыя ваенна-палітычныя мэты. Савецкі народ і Чырвоная армія вынеслі асноўны цяжар вайны і адыгралі вырашальную ролю ў разгроме фашызму. Менавіта на савецка-германскім фронце вермахт страціў 70 % асабовага складу, да 70 % танкаў, гармат, самалётаў.

Непамерную цану заплацілі народы СССР за перамогу на агрэсарам. Людскія страты склалі звыш 27 млн чалавек, з іх каля 12 млн – воіны Чырвонай арміі. У руінах ляжалі 1 710 гарадоў і заводаў, 65 тыс. км чыгуначных шляхоў, затапілі і ўзарвалі 1135 шахт, разрабавалі 427 музеяў і 43 тыс. бібліятэк. Матэрыяльныя страты дасягнулі амаль 1/3 нацыянальнага багацця краіны.

Велізарныя ахвяры панесла і Беларусь, якая страціла каля 3 млн жыхароў. Нямецка-фашысцкія захопнікі і іх саўдзельнікі разбурылі і спалілі 209 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, 9200 вёсак, з якіх 5295 цалкам ці часткова з іх жыхарамі, знішчылі ці вывезлі ў Германію больш за 10 тыс. прамысловых прадпрыемстваў, знішчылі 7 тыс. школ, нанеслі матэрыяльныя страты на суму 75 млрд рублёў (у цэнах 1941 г.).

Страты ўзброеных сіл Германіі і яе саюзнікаў перавышалі 15 млн чалавек (з іх на савецка-германскім фронце – 8,6 млн чалавек). ЗША і Вялікабрытанія страцілі каля 780 тыс. ваеннаслужачых.

Асноўнымі крыніцамі перамогі сталі масавы патрыятызм, мужнасць і самаахвярнасць, маральна-палітычная садружнасць народаў СССР. Савецкі народ не скарыўся перад магутнасцю германскай ваеннай машыны, як гэта здаралася з заходнімі дзяржавамі, а выстаяў, знайшоў у сабе сілы, каб пераламаць ход нябачанай у гісторыі барацьбы, атрымаць канчатковую перамогу. Абарона Айчына стала ідэяй, якая аб'яднала савецкае грамадства. Гэта была праведная справа. Савецкі салдат здолеў захаваць і праявіць лепшыя чалавечыя якасці: прыродны розум, бясстрашнасць і мужнасць, высокую фізічную і вайсковую падрыхтоўку, пачуццё сяброўства і брацтва, самаахвярнасць, стойкасць, гатоўнасць пераадольваць фізічныя і духоўныя цяжкасці, якія аказаліся непасільнымі для іншых. Але галоўнае – ён верыў у канчатковую

перамогу. За гады вайны звыш 400 чалавек паўтарылі подзвіг А. Матросава, у тым ліку 16 ураджэнцаў Беларусі. Масавай з'явай стаў паветраны таран. Такі подзвіг здзейснілі 598 экіпажаў.

Больш за 7 млн савецкіх воінаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, з іх 11 603 чалавекі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, у тым ліку 104 – двойчы, а трое – тройчы. Сярод іх прадстаўнікі 100 нацый і народнасцей: 7 998 – рускіх, 2 021 украінец, 446 беларусаў, 161 татарын, 107 яўрэяў, 96 казахаў, 90 грузін, 89 армян, 67 узбекаў, 63 мардвіны, 45 чувашоў, 43 азербайджанцы і інш.

Савецкія партызаны знішчылі і ўзялі ў палон 1,6 млн нямецка-фашысцкіх салдат і афіцэраў. За гераізм і мужнасць, праяўлены ў барацьбе з акупантамі, звыш 185 тыс. Партызан і падпольшчыкаў ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, з іх 234 чалавекі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза, у тым ліку 88 беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі.

Для больш дэталёвага разгляду гэтага пытання аўтары падручніка стварылі даволі грунтоўную дыдактычную базу, аснову якой у параграфе ствараюць 32 фота, 4 біяграфіі, 3 карты, 1 табліца і 3 вытрымкі з дакументаў («Дэкларацыя аб вызваленай Еўропе» з Камюніке аб канферэнцыі кіраўнікоў трох дзяржаў: Злучаных Штатаў Амерыкі, Савецкага Саюза і Вялікабрытаніі (па выніках Крымскай канферэнцыі 11 лютага 1945 г.,), «Акт аб ваеннай капітуляцыі германскіх узброеных сіл. Берлін. 8 мая 1945 г.».

Такім чынам, вучні і студэнты маюць усе неабходныя дыдактычныя матэрыялы для высновы аб тым, што Вялікая Перамога мае сусветна-гістарычнае значэнне, за якую савецкі народ, у тым ліку беларусы, заплацілі вельмі высокую цану.

## Навечна ў памяці народнай

Як адзначалася вышэй, новым у вучэбным дапаможніку з'яўляецца заключны параграф – «Памяць пра вайну» [1–2, с. 243–248; 4, 244–256; 5, с. 243–248]. Значна ўзбагачае ўяўленні пра трагічныя і гераічныя гістарычныя падзеі візуальны матэрыял, які шырока прадстаўлены на старонках параграфа ў колькасці 22 адзінак (галоўным чынам здымкі, малюнкі, факсімільныя адбіткі кніг). Аўтары ўвялі гэту тэму ўпершыню, надаючы вялікую павагу тым, хто даў пасляваенным пакаленням людзей жыць пад мірным і свабодным небам. Апроч таго захавання ў гістарычнай памяці патрабаваў і ўнікальны характар такой гістарычнай падзеі, як Вялікай Айчынная вайна. Адной з першых задач, якую вырашалі ў пасляваенным жыцці, было ўшанаванне памяці загінуўшых. На месцах баёў, памятных ваенных падзей і брацкіх магіл, як на тэрыторыі былога СССР, так і краін Еўропы, устаноўлены больш за 70 тыс. помнікаў.

На тэрыторыі сённяшняй Беларусі ўзведзены звыш 8,5 тыс. мемарыялаў, помнікаў і насыпаных рукамі людзей Курганоў Славы. На тысячах помнікаў і абеліскаў высечаны прозвішчы загінуўшых герояў – воінаў Чырвонай арміі, партызан і падпольшчыкаў. За праяву масавага гераізму і мужнасць у барацьбе

супраць нямецка-фашысцкіх агрэсараў 12 гарадам Савецкага Саюза прысвоена ганаровае званне горада-героя. Гэта – Ленінград, Валгаград (былы Сталінград), Севастопаль, Адэса, Кіеў, Масква, Мінск, Мурманск, Керч, Новарасійск, Тула, Смаленск. У 1971 г. званне крэпасць-герой атрымала Брэсцкая крэпасць.

Няма ў Беларусі такога кутка, які б не стаў месцам здзяйснення народнага подзвігу. І няма месца, дзе не шанавалі б гэтыя подзвігі. Абеліскі і помнікі, мемарыяльныя комплексы, Курганы Славы – каля падножжа многіх з іх гарыць Вечны агонь. Яны раскрываюць веліч подзвігу людзей ў імя свабоды і незалежнасці Радзімы, з'яўляюцца часткай духоўнага жыцця нашага грамадства.

Да ліку найбольш значных мемарыяльных комплексаў адносіцца перш за ўсё Брэсцкая крэпасць-герой, якая ўвекавечвае памяць пра подзвіг, здзейснены абаронцамі ў чэрвені–ліпені 1941 года. Кампазіцыйным цэнтрам ансамбля з'яўляецца манумент «Мужнасць» і 100-метровы штык-абеліск. З манументам аргагічна звязаны трыбуна і некропаль, дзе пахаваны астанкі 850 абаронцаў крэпасці. Сотні тысяч людзей з усяго свету едуць сюды, каб ушанаваць бессмяротны подзвіг герояў, сярод якіх былі такія нашы землякі, як палкавы камісар Ф. М. Фамін і капітан У. В. Шаблоўскі.

У 1954 г. у цэнты Мінска ўзведзены Манумент Перамогі, які сімвалізуе перамогу савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Сусветную вядомасць атрымаў мемарыяльны архітэктурна-скульптурны комплекс «Хатынь», які за савецкі час штогод наведвалі каля 1,5 млн чалавек. Ён створаны ў Лагойскім раёне Мінскай вобласці як сімвал ушанавання памяці жыхароў вёскі Хатынь, а таксама іншых беларускіх вёсак, спаленых гітлераўскімі варварамі разам з жыхарамі ў 1941–1944 гг. Тут на Могілках вёсак – 185 урнаў з зямлёй, прывезенай з тых вёсак Беларусі, што былі спалены разам з людзьмі і пасля не адноўлены. Побач – сімвалічнае Дрэва жыцця са спісам 433 беларускіх вёсак, знішчаных разам з жыхарамі і адроджанымі пасля вайны. У цэнтры мемарыяльнага комплексу ўзвышаецца бронзавая скульптура «Няскораны чалавек», што выяўляе апошняга жыхара Хатыні з забітым хлопчыкам на руках. На брацкай магіле ляжыць Вянок памяці з белага мармуру са словамі наказу мёртвым жывым. З другога боку Вянка памяці – адказ жывых загінуўшым. Комплекс уключае сцяну Жалобы вязняў фашысцкіх канцлагераў, на мемарыяльных плітах якой – назвы 66 найбольш буйных лагераў смерці і месцаў масавай згубы мірных грамадзян і ваеннапалонных на тэрыторыі Беларусі [15].

Мемарыяльны комплекс Азарычы створаны на месцы лагера смерці каля гарадскога пасёлка Азарычы (Калінкавіцкі раён), куды па загадзе нямецкага камандавання пад выглядам эвакуацыі было кінута ў пачатку сакавіка 1944 г. больш за 50 тыс. савецкіх грамадзян. Да дня вызвалення 18–19 сакавіка ў жывых засталося 33 480 чалавек, з іх дзяцей да 13 гадоў – 15 960.

Адным з самых новых месцаў ушанавання памяці еўрапейскага маштабу, падрыхтаваных па даручэнні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка, з'яўляецца мемарыяльны комплекс «Трасцянец», створаны на працягу апошніх гадоў і адкрыты з удзелам высокіх асоб нашай дзяржавы і іншых дзяржаў свету.

У ім ушаноўваецца памяць пра 206,5 тыс. ахвяр нацысцкага тэрору, у тым ліку грамадзянскага насельніцтва, ваеннапалонных, удзельнікаў патрыятычнага падполля, вязняў лагераў і мінскага гета, яўрэяў, дэпартаваных з краін Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі [16].

У Беларусі створана шмат мемарыяльных комплексаў, якія ўвекавечваюць подзвігі савецкіх воінаў і партызан. Гэта – мемарыялы воінскай славы, Курган Славы – вызваліцельніцы Беларусі на 21-м кіламетры шашы Мінск–Масква каля вёскі Слабада ў гонар подзвігу воінаў 1, 2, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага фронтоў, якія вызвалялі Беларусь летам 1944 года. У кожным раённым цэнтры, у многіх вёсках, у большасці цэнтральных сядзіб узведзены помнікі землякам, на якіх навечна высечаны прозвішчы загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Яны – даніна памяці ўдзячнага беларускага народа.

Важнай навуковай і культурнай установай з'яўляецца Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, адкрыты ў Мінску 22 кастрычніка 1944 года. [17]. На працягу ўсёй сваёй гісторыі ён выконвае і працягвае выконваць сваю высокую місію па захаванні памяці аб Вялікай Перамозе над германскім фашызмам. Да 70-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Мінску быў адкрыты новы музей, будаўніцтва якога пачалося з закладкі капсулы Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка 24 красавіка 2010 года. У 10 экспазіцыйных залах прадстаўлена звыш 8 тысяч экспазіцыйных матэрыялаў, агульная колькасць якіх у фондах музея складаецца з 28 калекцый і налічвае звыш 144 тысяч адзінак захавання.

Завяршае экспазіцыю музея зала Перамогі, у якой спалучаны Памяць і Слава пра подзвіг народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. На мармуровых плітах высечаны імёны больш 2-х тыс. байцоў і камандзіраў Чырвонай арміі і другіх вайсковых фарміраванняў, падпольшчыкаў і партызан – Герояў Савецкага Саюза, сярод іх беларусы і ўраджэнцы Беларусі, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Адным з першых беларусаў, хто атрымаў высокае званне Героя, быў танкіст П. Е. Купрыянаў – актыўны ўдзельнік вайны ў Іспаніі. За мужнасць, праяўленую ў баі пад Мадрыдам, ён 31 снежня 1936 г. пасмяротна ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Першым у Савецкім Саюзе двойчы Героем стаў лётчык беларус С. І. Грыцавец, які ў 1939 г. за выкананне асобнага дзяржаўнага задання і за ўдзел у баях з японскімі захопнікамі на рацэ Халхін-Гол атрымаў дзве Залатыя Зоркі. У жніўні 1941 г. Героямі сталі народныя мсціўцы Беларусі, арганізатары і кіраўнікі аднаго з першых партызанскіх атрадаў – Ц. П. Бумажкоў і Ф. М. Паўлоўскі.

У Зале Перамогі залатымі літарамі ўпісаны назвы часцей і злучэнняў 1, 2, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў, партызанскіх атрадаў і брыгад, якія ўдзельнічалі ў вызваленні нашай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Па ліку ахвяр Другая сусветнай вайна не ведае сабе роўных у гісторыі: яна ўнесла жыцці 60 млн чалавек. Страты Савецкага Саюза складалі 26,6 млн чалавек. На тэрыторыі Беларусі было загублена больш 2357 тыс. мірных жыхароў і ваеннапалонных [17, с. 24].

Вялікая ўвага надаецца духоўнай памяці. Выдатным помнікам подзвігу нашага народа з'яўляецца 146-томнае выданне гісторыка-дакументальных хронік «Памяць», якое выдаецца з 1985 г. па рашэнні ўрада рэспублікі. Айчынныя гісторыкі апублікавалі каля 12 тысяч работ. Галоўнай скарбонкай народнай памяці пра вайну з'яўляюцца архівы. Падзеі Вялікай Айчыннай вайны знайшлі адлюстраванне таксама ў мастацкай літаратуры, кінафільмах, музычных творах, выяўленчым мастацтве. Адной за важных задач застаецца фарміраванне сучаснай культуры памяці ў Беларусі.

Адзначым, што самастойная праца школьнікаў і студэнтаў з дадатковымі матэрыяламі і візуальнымі крыніцамі садзейнічаюць фарміраванню крытычнага аналізу, лагічнага мыслення, сінтэзу і абагульнення фактаў. Моладзь выпрацоўвае ўласную пазіцыю ў адносінах да гістарычных падзей, удасканальваючы свае ўменне па авалоданні неабходнымі гістарычнымі ведамі аб гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама аб Вялікай Перамозе.

**Заключэнне.** Вырашэнне трыадзінай метадалагічнай задачы на старонках вучэбнага дапаможніка «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» паказвае, што: 1) важнасць і складанасць тэмы патрабуе выкарыстання розных кампанентаў вучэбнага, выхаваўчага і грамадскага характару; 2) у фокусе вырашэння галоўных дыдактычных задач трывала знаходзіцца выхавання і развіццё маладой асобы; 3) вылучаныя матэрыялы спрыяюць развіццю гістарычнага мыслення моладзі, заахвочваюць яе да комплекснага аналізу гістарычных падзей вайны, асабліва гісторыі Вялікай Перамогі; 4) праблемны падыход стварае найбольш спрыяльныя ўмовы для фарміравання і развіцця вучэбна-пазнавальных і даследчых кампетэнцый вучняў і студэнтаў праз выкананне імі розных задач самастойнай работы; 5) на кожным занятку па гісторыі і пры правядзенні самастойнай работы з гістарычнымі матэрыяламі вучні і студэнты атрымліваюць магчымасць не толькі набываць гістарычныя веды, але і выкарыстоўваць іх на практыцы, у тым ліку ў нестандартных сітуацыях пры вырашэнні актуальных інфармацыйных задач. Усё гэта садзейнічае не толькі адукацыйнаму развіццю сучаснай беларускай моладзі, але і спрыяе фарміраванню ў яе патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, грамадзянскасці, гонару за сваю краіну і любові да сваёй малой і вялікай Радзімы – суверэннай Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агул. сярэд. адукацыі, з бел. мовай навучання з 11-гадовым тэрмінам навучання / А. А. Каваленя, М. А. Краснова, У. І. Лемяшонак і інш.; Пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2004. – 231 с.

2. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : учеб. пособие для 11-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / А. А. Коваленя [и др.]. ; под ред. А. А. Ковалени, Н. С. Сташкевича. – Минск : Изд. центр БГУ, 2004. – 231 с.

3. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): Вучэб. дапам. для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне вышэйшай адукацыі / А. А. Каваленя, У. І. Лемяшонак, Б. Дз. Далгатовіч і інш.; Пад рэд. А. А. Кавалені, М. С. Сташкевіча. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2004. – 279 с.

4. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : учеб. пособие / сост. А. А. Коваленя [и др.]; под. ред. А. А. Ковалени и Н. С. Сташкевича. – Минск : Изд. центр БГУ, 2005. – 271 с.

5. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : учеб. пособие для 11-го кл. общеобразоват. учреждений с рус. яз. обучения / А. А. Коваленя [и др.]. ; под ред. А. А. Ковалени, Н. С. Сташкевича. – 2е изд., испр. – Минск : Изд. центр БГУ, 2009. – 231 с.

6. Великая Отечественная война советского народа (в контексте Второй мировой войны) : хрестоматия : пособие для учащихся 11-го кл. / сост. А. А. Коваленя, М. А. Краснова, В. И. Лемешонок, С. Е. Новиков; науч. ред. А. А. Коваленя. – Минск : Белор. наука, 2008. – 350 с.

7. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941–1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. кол.), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко и др. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.

8. *Новікаў, С. Я.* Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў / С. Я. Новікаў. – Мінск : МДЛУ, 2014. – 300 с.

9. *Коваленя, А. А.* Беларусь в Великой Отечественной войне: героизм, трагедия, подвиг / А. А. Коваленя // Актуальные проблемы Второй мировой и Великой Отечественной войн (к 65-летию Великой Победы) : материалы V Междунар. летней школы молодых историков стран СНГ (Минск, 14–23 июня 2010 г.) / сост. А. А. Коваленя, В. В. Данилович, М. Г. Жилинский; редсовет: О. А. Чубарьян [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – С. 6–28.

10. *Краснова, М. А.* Изучение Второй мировой и Великой Отечественной войн в школах Беларуси / М. А. Краснова // Актуальные проблемы Второй мировой и Великой Отечественной войн (к 65-летию Великой Победы) : материалы V Междунар. летней школы молодых историков стран СНГ (Минск, 14–23 июня 2010 г.) / сост. А. А. Коваленя, В. В. Данилович, М. Г. Жилинский; редсовет: О. А. Чубарьян [и др.]. – Минск : Беларус. Навука, 2010. – С. 154–162.

11. *Литвин, А. М.* Вклад белорусского народа в разгром нацистской Германии / А. М. Литвин // Актуальные проблемы Второй мировой и Великой Отечественной войн (к 65-летию Великой Победы) : материалы Междунар. летней школы молодых историков стран СНГ (Минск, 14–23 июня 2010 г.) / сост. А. А. Коваленя, В. В. Данилович, М. Г. Жилинский; редсовет: О. А. Чубарьян [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2010. – С. 167–174.

12. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А. М. Литвин [и др.]; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларуская навука, 2015. – 495 с.

13. Этот день мы приближали как могли…: материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию Победы в Великой Отечественной войне и окончания Второй мировой войны (Минск, 7–8 мая 2015 г.): в. 2 ч. / редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2016. – Ч. 1. – 517 с.

14. Этот день мы приближали как могли…: материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 70-летию Победы в Великой Отечественной войне и окончания Второй мировой войны (Минск, 7–8 мая 2015 г.): в. 2 ч. / редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2016. – Ч. 2. – 322 с.

15. Хатынь. Трагедия и память : док. и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.]. – Минск: НАРБ, 2009. – 272 с.

16. Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси : документы и материалы / сост. : В. И. Адамушко [и др.] ; редкол. : В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – 520 с.

17. Белорусский государственный музей истории Великой Отечественной войны. Буклет. – Минск : БГМИВОВ, 2014. – 30 с.